**ПРАВААБАРОНЦЫ ЗА СВАБОДНЫЯ ВЫБАРЫ**

**Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь**

# Аналітычная тыднёвая справаздача па выніках назірання: 13-19 ліпеня 2020 года

*Назіранне за выбарамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца РПГА "Беларускі Хельсінкскі камітэт" і ПЦ "Вясна" ў рамках кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары".*

## Высновы

- Улады дэманструюць беспрэцэдэнтны ўзровень ціску на ўдзельнікаў выбарчага працэсу. На сёння ў Беларусі налічваецца 25 палітзняволеных, большасць з якіх звязаная з удзелам у выбарчай кампаніі – прэтэндэнты ў кандыдаты, кіраўнікі і сябры ініцыятыўных груп, блогеры;
- працягваецца судовы пераслед удзельнікаў акцый салідарнасці, якія праходзілі ў Мінску і рэгіёнах;
- непрапарцыйна жорсткія дзеянні супрацоўнікаў міліцыі па затрыманні мірных грамадзян толькі за факт знаходжання іх на вуліцах справакавалі рэакцыю людзей у адказ, у тым ліку, на жаль, з прымяненнем сілы ў дачыненні да прадстаўнікоў сілавых органаў, што прывяло да ўзбуджэння крымінальных спраў;
- прадстаўнікі міжнародных арганізацый і ўрадаў замежных краін выказалі занепакоенасць адмовай у рэгістрацыі ў якасці кандыдатаў некаторых прэтэндэнтаў, рэпрэсіямі супраць апазіцыйных палітыкаў, грамадзян, масавымі затрыманнямі на мірных акцыях;
- упершыню за ўсю гісторыю незалежнай Беларусі назіральнікі Бюро АБСЕ па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (БДІПЧ) не будуць назіраць за выбарамі;
- падача скаргаў і зваротаў па-ранейшаму застаецца неэфектыўным сродкам абароны парушаных выбарчых правоў як асобаў, якія вылучаюцца кандыдатамі ў Прэзідэнты, так і іншых удзельнікаў выбараў і назіральнікаў.

## Агульная сітуацыя

14 ліпеня на вуліцы беларускай сталіцы і іншых гарадоў краіны выйшлі грамадзяне, незадаволеныя працэдурай рэгістрацыі кандыдатаў у Прэзідэнты, у

выніку якой Віктар Бабарыка і Валерый Цапкала былі выключаныя з выбарчай гонкі. Улады пачалі прымяняць да мірных людзей сілавыя меры і, паводле назіральнікаў кампаніі, толькі ў Мінску было затрымана больш за 250 чалавек. Непрапарцыйна жорсткія дзеянні супрацоўнікаў міліцыі па затрыманні мірных грамадзян толькі за факт знаходжання іх на вуліцах справакавалі рэакцыю людзей у адказ, у тым ліку, на жаль, з прымяненнем сілы ў дачыненні да прадстаўнікоў сілавых органаў. Следчы камітэт 15 ліпеня паведаміў аб узбуджэнні крымінальнай справы паводле арт. 342 КК (арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх), а 16 ліпеня – аб завядзенні крымінальных спраў па арт. 363 (супраціўленне супрацоўніку органаў унутраных спраў) і арт. 364 (гвалт у дачыненні да супрацоўніка органаў унутраных спраў) Крымінальнага кодэкса. Затрыманыя чацвёра чалавек[1].

Затрыманні працягнуліся 15 ліпеня, калі пасля закрыцця ЦВК у 19.00 жадаючыя падаць скаргі на адмову ў рэгістрацыі двух прэтэндэнтаў спрабавалі разыйсціся, а некаторыя – адправіць скаргі па пошце. Каб перашкодзіць грамадзянам зрабіць гэта, ўлады тэрмінова закрылі галоўпаштамт, перакрылі станцыі метро ў цэнтры Мінска, закрылі кругласутачнае паштовае аддзяленне на чыгуначным вакзале. Старшыня Цэнтральнай камісіі абвінаваціла штабы Віктара Бабарыкі і Валерыя Цапкалы ў арганізацыі акцый пратэсту.15 ліпеня стала вядома, што ўпершыню за ўсю гісторыю незалежнай Беларусі назіральнікі Бюро АБСЕ па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (БДІПЧ) не будуць назіраць за выбарамі. У гэты дзень дырэктарка БДІПЧ Інгіб'ёрг Сальрун Гісладацір праінфармавала МЗС Беларусі аб тым, што адсутнасць своечасовага запрашэння ад афіцыйнага Мінска не дазваляе БДІПЧ назіраць за ходам выбарчага працэсу. Яна адзначыла, што адсутнасць своечасовага запрашэння больш чым праз два месяцы пасля абвяшчэння выбараў не дазволіла БДІПЧ назіраць за ключавымі аспектамі выбарчага працэсу[2]. “Пасля ўспышкі пандэміі каранавіруса БДІПЧ прыклала ўсе намаганні для выканання свайго мандата па назіранні за выбарамі і праводзіла назіранне ў некалькіх краінах. Адсутнасць своечасовага запрашэння ў такой складанай сітуацыі адлюстроўвае невыкананне абавязацельстваў па супрацоўніцтву з назіральнікамі за выбарамі ад БДІПЧ, як гэта прадугледжана абавязацельствамі АБСЕ” – адзначана ў заяве дырэктаркі БДІПЧ. У той жа час Гісладацір выказала сваю глыбокую занепакоенасць паведамленнямі аб тым, што патэнцыйных кандыдатаў запалохвалі, а актывістаў арыштоўвалі. “Абарона асноўных свабодаў сходаў і выказвання меркаванняў з'яўляецца папярэдняй умовай для правядзення сапраўды дэмакратычных выбараў”, – сказала яна. Дырэктарка БДІПЧ заклікала ўлады распачаць канкрэтныя і неадкладныя крокі для абароны ажыццяўлення асноўных свабодаў у Беларусі.

[1] Даступна тут: https://t.me/skgovby/2846
[2] Даступна тут: https://www.osce.org/odihr/elections/457309

15 ліпеня прэс-сакратар МЗС Беларусі Анатоль Глаз адзначыў, што рашэнне БДІПЧ стала нечаканасцю і выказаў спадзеў, што яно будзе перагледжана. Па яго словах, пасля рэгістрацыі кандыдатаў у поўнай адпаведнасці з раней зробленымі публічнымі заявамі МЗС накіравала запрашэнні на выбары ў адрас Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ, СНД і Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. А. Глаз адзначыў, што краіна ні на крок не адступае ад сваіх абавязацельстваў, у тым ліку ў рамках АБСЕ[3].

16 ліпеня на сайце АБСЕ была апублікавана заява, у якой прадстаўнікі Парламенцкай асамблеі АБСЕ падвергнулі крытыцы адсутнасць своечасовага запрашэння ад беларускіх уладаў для назірання за прэзідэнцкімі выбарамі[4]. Кіраўнік камітэта по правах чалавека ПА АБСЕ Кірыякас Хаджыяні, яго намеснік Мікаэль Лінк і дакладчыца Кары Хенрыксан падкрэслілі, што адсутнасць своечасовага запрашэння не суадносіцца з абавязальніцтвамі Беларусі як члена АБСЕ. Як адзначаецца ў сумеснай заяве, усе краіны-ўдзельніцы АБСЕ згодна з Капенгагенскім дакументам ад 1990 года абавязаныя садзейнічаць назіранню за выбарамі з боку іншых краін-удзельніц.

Дзяржаўныя СМІ даюць інфармацыю, што армія і іншыя сілавыя структуры рыхтуюцца да прадухілення масавых беспарадкаў. Пра гэта 16 ліпеня заявіў дзяржсакратар Савету бяспекі Андрэй Раўкоў падчас наведвання Аляксандрам Лукашэнкам 103-й Віцебскай асобнай гвардзейскай паветрана-дэсантнай брыгады.

16 ліпеня ўначы на працягу некалькіх гадзін назіраліся праблемы ў працы бяспечнага, зашыфраванага падлучэння VPN. З тэхнічных супольнасцяў паступала інфармацыя аб праблемах з тунэлямі з Беларусі ў ЗША, Германію, Расію. З’явіліся паведамленні аб тым, што ў гэты час у Мінску, абласных гарадах, а таксама Мазыры, Пінску, Лідзе, Наваполацку, Барысаве, Жодзіна не працаваў мэсэнджар Telegram.[5]

16 ліпеня аб’яўлена аб аб'яднанні намаганняў штабоў трох альтэрнатыўных кандыдатаў: Святланы Ціханоўскай, Валерыя Цапкалы і Віктара Бабарыкі. 17 ліпеня аб’яднаны штаб правёў першую прэс-канферэнцыю.

Старшыня Цэнтральнай камісіі назвала аб'яднанне штабоў на карысць аднаго кандыдата не адпавядаючым духу і працэдуры выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Лідзія Ярмошына таксама дала ацэнку прапанаванай раней адным з штабоў ініцыятыве па дзеяннях выбаршчыкаў у дзень галасавання (фатаграфаванне і выстаўленне ў сацсеткі свайго выбарчага бюлетэня з прастаўленнай адзнакай за таго ці іншага кандыдата). Такія дзеянні, па яе словах, учыненыя 9 жніўня да 20.00, будуць расцэньваецца як агітацыя ў дзень выбараў.

16 ліпеня Цэнтрвыбаркам Беларусі прыняў пастановы аб вызначэнні пераліку давераных асоб чатырох кандыдатаў: Аляксандра Лукашэнкі, Святланы Ціханоўскай, Андрэя Дзмітрыева і Сяргея Чэрачня.

---

[3] Даступна тут: https://news.tut.by/economics/692851.html
[4] Даступна тут: https://www.osce.org/parliamentary-assembly/457405
[5] Даступна тут: https://42.tut.by/693035; https://42.tut.by/692967.

**Скаргі і звароты**

Згодна з артыкулам 68-1 ВК рашэнне Цэнтральнай камісіі аб адмове ў рэгістрацыі кандыдатам у прэзідэнты можа быць абскарджана асобай, якая вылучана кандыдатам у прэзідэнты, у Вярхоўны суд у трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння. Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь разглядае скаргу ў трохдзённы тэрмін.

16 ліпеня Валерый Цапкала падаў скаргу ў Вярхоўны Суд на рашэнне ЦВК не рэгістраваць яго кандыдатам у прэзідэнты. Прадстаўнік Віктара Бабарыкі адвакат Максім Знак зрабіў гэта напярэдадні. Аднак па скарзе Знака Вярхоўны Суд не стаў ўзбуджаць грамадзянскую справу.

Вярхоўны суд 16 ліпеня размясціў у сябе на сайце вызначэнне аб адмове ва ўзбуджэнні грамадзянскай справы па гэтай скарзе. Суддзя Вярхоўнага Суда Валянціна Кулік абгрунтавала рашэнне тым, "што права на абскарджанне ў суд адмовы ў рэгістрацыі кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь прадастаўлена законам толькі асобе, якая вылучана кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. Бабарыка В.Д., які мае намер быць кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, пастанову Цэнтральнай камісіі ад 14 ліпеня 2020 года № 92 не абскарджваў і скаргу ў Вярхоўны Суд не падпісаў. Паколькі падпісанне такой скаргі прадстаўнікам асобы, якая вылучана кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, выбарчым заканадаўствам не прадугледжана, ва ўзбуджэнні справы варта адмовіць"[6]. Вызначэнне ўступіла ў законную сілу неадкладна, у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам яно не падлягае абскарджанню і апратэставанню. Нагадаем, палітвязень Віктар Бабарыка ўтрымліваецца на дадзены момант пад арыштам у СІЗА КДБ па абвінавачванні ў здзяйсненні шэрагу эканамічных злачынстваў.

Назіральнікі кампаніі атрымалі адказы на свае звароты ў органы мясцовай улады аб паляпшэнні ўмоў для агітыцыі. Так, Барысаўскі раённы выканаўчы камітэт адмовіў у задавальненні скаргі назіральніка Алега Мацкевіча, які прасіў пераглядзець рашэнне Барысаўскага раённага выканаўчага камітэта «Аб некаторых пытаннях арганізацыі і правядзення выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 2020 годзе». Адзначым, што гэтым рашэннем для правядзення ў паведамляльным парадку масавых мерапрыемстваў (сходаў па-за памяшканнем, мітынгаў, пікетавання) з мэтай перадвыбарнай агітацыі, вызначана толькі адно месца на ўвесь Барысаўскі раён. У скарзе назіральнік звярнуў увагу на тое, што дадзенае рашэнне груба парушае права грамадзян на ўдзел у агітацыі, не ўлічаны інтарэсы не толькі барысаўчан, але і жыхараў раёна, якім, каб прысутнічаць на агітацыйным масавым мерапрыемстве трэба ехаць у раённы цэнтр.

У адказе, падпісаным намеснікам старшыні райвыканкама Копікавай А.Ф., у якасці абгрунтавання адмовы ў задавальненні скаргі было адзначана: «Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь не рэгламентуе колькасць месцаў, у якіх кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, іх давераныя асобы ў мэтах ажыццяўлення

[6] Даступна тут: http://court.gov.by/ru/sudebnie/postanovleniya/f41974935efa4306.html

перадвыбарнай агітацыі могуць праводзіць масавыя мерапрыемствы (сходы па-за памяшканнямі, мітынгі, пікетаванне)».

На зварот назіральніка Віктара Адзіночанкі з просьбай даць тлумачэнні, чым абумоўлена прынясце рашэння "Аб вызначэнні ў горадзе Гомелі месцаў для ажыццяўлення перадвыбарчай агітацыі" ад 30.06.2020 г. № 649, якое не дае магчымасці правядзення поўнавартаснай агітацыйнай кампаніі ў Гомелі і таксама парушае правы выбаршчыкаў, Гомельскі гарадскі выканаўчы камітэт безапеляцыйна адказаў, што рашэнне прынята ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

Адпіскай можна назваць адказ намесніка старшыні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Арцёма Цурана на зварот назіральніка кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары" у Фрунзенскім раёне г. Мінска Аляксея Лойкі. У сваім звароце назіральнік параўнаў рашэнні Мінгарвыканкама аб вызначэнні ў г. Мінску месцаў для ажыццяўлення перадвыбарчай агітацыі пры правядзенні выбараў Прэзідэнта за 2015 і 2020 год. Лойка звярнуў увагу на тое, што сёлетняе рашэнне істотна пагаршае умовы агітацыі і сур'ёзна абмяжоўвае магчымасці для рэалізацыі выбарчых правоў грамадзян і кандыдатаў у Прэзідэнты на ажыццяўленне перадвыбарчай агітацыі.

Так, у параўнанні з аналагічным рашэннем Мінгарвыканкама 1 верасня 2015 г. № 2369 колькасць памяшканняў для правядзення сустрэч кандыдатаў і іх давераных асобаў з выбаршчыкамі, а таксама для сходаў, якія арганізуюцца выбаршчыкамі, скарацілася з 54 да 8 памяшканняў. Колькасць месцаў для ўстаноўкі інфармацыйных стэндаў для агітацыйных друкаваных матэрыялаў кандыдатаў скарочана з 61 да 21. Для правядзення ў паведамляльным парадку кандыдатамі і іх даверанымі асобамі масавых агітацыйных мерапрыемстваў на ўвесь Фрунзенскі раён вызначана толькі 1 месца. Пры гэтым яно не прыстасаванае для вялікай колькасці магчымых ўдзельнікаў сходу, знаходзіцца ў вельмі нязручным месцы (ходзіць толькі 2 тралейбусы). Між тым, падчас выбараў 2015 года агітаваць можна было паўсюль, дзе гэта прама не забаронена. Назіральнік таксама спаслаўся на пастанову ЦВК ад 20 красавіка 2020 г. № 7, згодна з якой у якасці месцаў для правядзення такіх масавых мерапрыемстваў рэкамендуецца вызначаць любыя месцы, не забароненыя для гэтага.

Нягледзячы на грунтоўную аргументацыю на карысць неабходнасці ўнясення зменаў у адпаведнае рашэнне, Мінгарвыканкам паведаміў, што прынятае рашэнне "не ўтрымлівае прынцыпова новых падыходаў да прававога рэгулявання ў дадзенай сферы грамадскіх адносінаў", яно прынята ў адпаведнасці з выбарчым заканадаўствам.